Весці БДПУ. Серыя 1. 2024. № 3. С. 21–25

*УДК [378.091.2:398.8](476)*

# ПРАКТЫКААРЫЕНТАВАНАСЦЬ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАГА ПЕСЕННАГА ФАЛЬКЛОРА БУДУЧЫМІ ПЕДАГОГАМІ-МУЗЫКАНТАМІ

**Н. Г. Мазурына,**
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0002-2275-2700*

Паступіў у рэдакцыю 12.07.2024.

*UDC [378.091.2:398.8](476)*

# PRACTICAL ORIENTATION OF SCIENTIFIC RESEARCH OF BELARUSIAN SONG FOLKLORE BY FUTURE TEACHERS-MUSICIANS

**N. Mazuryna,**
*Candidate of Philology, Associate Professor theory and methods of teaching art Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*
*ORCID: https://orcid.org/0000-0002-2275-2700*

Received on 12.07.2024.

Артыкул прысвечаны аналізу практычных аспектаў выкарыстання вынікаў навуковых даследаванняў беларускага песеннага фальклора будучымі педагогамі-музыкантамі на прыкладзе дзейнасці студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі факультэта эстэтычнай адукацыі «Дыялог мастацтваў». Апісаны прыклады ажыццяўлення некаторых найбольш значных комплексных праектаў, у тым ліку звязаных з актуальнай тэмай навуковага пошуку – «Дыялог народнага песеннага і прафесійнага харавога мастацтва ў творчай спадчыне У. І. Раговіча». Аналізуюцца розныя аспекты падрыхтоўкі педагогаў-музыкантаў на аснове выкарыстання праблемнага метаду і праектнай тэхналогіі ў актуальным для СНДЛ фармаце. У кантэксце сістэмы мастацка-эстэтычнай адукацыі выяўляюцца і раскрываюцца пытанні сувязі студэнцкіх навуковых даследаванняў з асноўнымі напрамкамі сучаснай навукі. Праведзенае даследаванне паслужыць асновай для распрацоўкі практыкаарыентаваных вучэбна-метадычных матэрыялаў, перспектыўных напрамкаў навуковых і інавацыйных даследаванняў. Вызначаны адметныя рысы і асаблівасці фарміравання прафесійных, каштоўнасных і інтэлектуальных арыенціраў у сферы падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі праз дзейнасць у складзе студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі факультэта эстэтычнай адукацыі.

*Ключавыя словы*: студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя, беларускі фальклор, народная песня, У. І. Раговіч, мастацка-эстэтычная адукацыя.

The article is devoted to the analysis of practical aspects of the use of the results of scientific research of Belarusian song folklore by future music teachers using the example of the activities of the student research laboratory of the Faculty of Aesthetic Education “Dialogue of the Arts”. Examples of the implementation of some of the most significant complex projects are described, including those related to the current topic of scientific research – “Dialogue of folk song and professional choral art in the creative heritage of U. I. Ragovich.” Various aspects of music teacher training are analyzed based on the use of the problem-based method and project technology in a format appropriate for SNDL. In the context of the system of artistic and aesthetic education, issues of connection between student scientific research and the main directions of modern science are identified and disclosed. The conducted research will serve as the basis for the development of practice-oriented educational and methodological materials, promising areas of scientific and innovative research. The distinctive features and features of the formation of professional, value and intellectual guidelines in the field of training highly qualified specialists through the activities of the student research laboratory of the Faculty of Aesthetic Education are identified.

*Keywords:* student research laboratory, Belarusian folklore, folk song, Vladimir Ragovich, artistic and aesthetic education.

Адным з найважнейшых патрабаванняў да сучаснага ўзроўню падрыхтоўкі будучых настаўнікаў з’яўляецца развіццё іх прафесійных кампетэнцый у напрамках вучэбнай, выхаваўчай і навукова-даследчай дзейнасці. Фарміраванне кампетэнцый студэнтаў эстэтычных спецыяльнасцей – будучых педагогаў музыкі, рытмікі і харэаграфіі, сусветнай і айчыннай мастацкай культуры, выяўленчага мастацтва, педагогаў дадатковай адукацыі – уяўляе сабой складаны працэс засваення як сістэмы светапоглядных універсалій, так і вузкаспецыфічных практычных навыкаў. Аб’яднаць розныя аспекты падрыхтоўкі спецыялістаў у актуальным фармаце на аснове выкарыстання праблемнага метаду дазваляе Студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя (далей – СНДЛ). У структуры кожнай установы вышэйшай адукацыі, кожнага факультэта яна мае свае адметныя рысы і асаблівасці. Таму аналіз тэмы, прадстаўленай у дадзеным артыкуле, з’яўляецца актуальным.

Студэнцкая навукова даследчая лабараторыя – гэта ўнікальная з'ява, якая ўяўляе сабою адлюстраванне прафесійных, каштоўнасных і інтэлектуальных арыенціраў у сферы падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Праца СНДЛ факультэта эстэтычнай адукацыі «Дыялог мастацтваў» здзяйсняецца з 2017 г. і ў сённяшні час вядзецца ў межах навукова-даследчай работы кафедры па тэме «Мадэрнізацыя навукова-метадычнага забеспячэння падрыхтоўкі выкладчыкаў прадметнай вобласці “Мастацтва” ва ўмовах інтэграцыі полімастацкага і полікультурнага асяроддзя постіндустрыяльнага грамадства» на 2021–2025 гг.

У бягучым навучальным годзе напрамкам навуковага пошуку з'яўляецца вывучэнне дыялога народнага песеннага і прафесійнага харавога мастацтва на прыкладзе творчай спадчыны Уладзіміра Іосіфавіча Раговіча. Выбар тэмы даследавання абумоўлены тым, што ў 2024 г. адзначаецца 85-гадовы юбілей з дня нараджэння гэтага выбітнога дзеяча Беларусі. Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Беларускай дзяржаўнай акадэмічнай капэлы БССР, вучань і пераемнік жыццёвых і творчых прынцыпаў Р. Р. Шырмы, кампазітар і фальклярыст, педагог У. І. Раговіч зрабіў значны ўнёсак у беларускую музычную культуру і адукацыю. Яму прысвечаны фрагмент экспазіцыі Музея БДПУ, бо ў 1980-я гг. Уладзімір Іосіфавіч узначальваў кафедру харавога дырыжыравання на музычна-педагагічным факультэце.

У якасці задач дзейнасці СНДЛ «Дыялог мастацтваў» планавалася:

– правесці архіўна-пошукавую працу дакументаў, фота- і аўдыёматэрыялаў аб творчай спадчыне У. І. Раговіча;
– стварыць каталог дакументаў, фота- і аўдыёматэрыялаў;
– стварыць каталог харавых апрацовак У. І. Раговіча;
– прааналізаваць творчую спадчыну юбіляра ва ўмовах сучаснага полікультурнага адукацыйнага асяроддзя.

Формы арганізацыі дзейнасці СНДЛ «Дыялог мастацтваў» уключаюць навучальныя семінары, круглыя сталы і дыялогавыя пляцоўкі навуковай накіраванасці, а таксама работу ў парах і малых групах над распрацоўкай пэўных навукова-практычных задач, над навуковымі публікацыямі, якія прадстаўляюць вынікі даследаванняў.

Формамі прадстаўлення вынікаў работы СНДЛ з'явіліся: выступленне з навуковымі дакладамі на Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях як у Беларусі, так і за яе межамі, публікацыя навуковых артыкулаў, удзел у навуковых і выхаваўчых мерапрыемствах у БДПУ, у творчых конкурсах і фестывалях, распрацоўка метадычных рэкамендацый па выкарыстанні творчай спадчыны У. І. Раговіча ў навучальным і выхаваўчым працэсе ва ўмовах полікультурнага адукацыйнага асяроддзя.

Важнай формай укаранення вынікаў навукова-даследчай дзейнасці лабараторыі з'яўляецца іх практычнае выкарыстанне ў працэсе падрыхтоўкі педагогаў-музыкантаў у БДПУ як вядучай педагагічнай установе вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, у вучэбнай і выхаваўчай дзейнасці. Так, яшчэ ў 2022/2023 навучальным годзе прайшла апрабацыя новага харавога рэпертуару – выніку даследчых пошукаў па тэме СНДЛ – на II Фестывалі харавой музыкі «Калядны спеў» у выкананні харавога калектыву факультэта эстэтычнай адукацыі Gaudeamus пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры музычна-педагагічнай адукацыі Л. М. Ядлоўскай. Адна з калядных песень – «Го-го-го, казёл» [2, с. 321], запісаная і аранжыраваная Уладзімірам Раговічам для мяшанага хору – прыклад старадаўняй беларускай каляндарна-абрадавай музыкі. Гэта класічная традыцыйная песня абыходнага каляднага абраду, пабудаваная на тыпавых метра-рытмічных формулах і формульных напевах беларускага нацыянальнага меласу.

Новай формай практычнага ўкаранення вынікаў навукова-даследчай дзейнасці студэнцкай лабараторыі, што была вынайдзена і выкарыстана на працягу 2023/2024 навучальнага года, стаў праект «Народныя песні запісу У. І. Раговіча ў класе вакала». У ім прынялі ўдзел не толькі члены студэнцкай лабараторыі, але і ўсе студэнты факультэта эстэтычнай адукацыі БДПУ, што займаліся навучаннем у класе вакала, у тым ліку і студэнты з КНР. Вучэбна-практычныя і навукова-даследчыя аспекты працы СНДЛ цесна перапляліся ў прапанаваным праекце.

У межах III фестывалю-конкурсу народнай песні імя А. В. Рашчынскага намеснік старшыні студэнцкай лабараторыі Нікаліна Кот выканала беларускую народную песню «Соловэй зозулю к собэ намовляе» (клас вакала старшага выкладчыка І. У. Жарскай) і атрымала Дыплом лаўрэата II ступені. Прадстаўленая лірычная песня з'яўляецца прыкладам высокамастацкай народнай паэзіі і меласу. Яна была запісана ад носьбітаў аўтэнтычнай народнай традыцыі ў канцы XX ст. на Беларускім Палессі і перадае гучанне моўнага і музычнага дыялектаў. Выбар песні студэнткай быў зроблены свядома пасля доўгага працэсу аналіза зборнікаў народных песень [1; 2], вывучэння асаблівасцяў фанетыкі і лексікі беларускіх гаворак, характэрных выканальніцкіх прыёмаў народных спеваў, асабістага пераасэнсавання зме-

сту і пошуку мастацкай трактоўкі паэтычнага тэксту песні.

Члены СНДЛ вучацца ўпэўнена, аргументавана і эфектна асвятляць тэмы самастойных навуковых работ. Падтрымка і навуковае кіраўніцтва педагога дазваляе студэнтам убачыць новыя грані сваіх даследаванняў і расказаць пра гэта слухачам семінараў, удзельнікам навуковых круглых сталоў і студэнцкіх канферэнцый. Вынікі навуковых даследаванняў і метадычныя распрацоўкі членаў СНДЛ прадстаўляюцца на міжнародных навукова-практычных канферэнцыях [3–5], конкурсах (такіх як Рэспубліканскі конкурс метадычных матэрыялаў «Обучаем. Продвигаем. Действуем», што быў ініцыіраваны Каардынацыйным цэнтрам АУР БДПУ), апублікаваны ў навуковых часопісах і зборніках навуковых артыкулаў.

Унікальнай асаблівасцю СНДЛ «Дыялог мастацтваў» з'яўляецца той факт, што практычна з першых гадоў яе дзейнасці разам з беларускімі студэнтамі і аспірантамі ў яе ўваходзяць магістранты і аспіранты з Кітайскай Народнай Рэспублікі. У апошнія пяць гадоў на факультэце эстэтычнай адукацыі БДПУ колькасць навучэнцаў з ліку замежных грамадзян значна вырасла з адзінак да некалькіх соцень на сённяшні час. Таму вынікі дзейнасці студэнцкай лабараторыі шмат у чым залежаць ад умення кіраваць працэсам міжкультурнага ўзаемадзеяння членаў даследчыцкага калектыву, наладжванні працэсу разумення і сумеснай працы. Шматузроўневае настаўніцтва ў СНДЛ «Дыялог мастацтваў» ажыццяўляецца як на лініі зносін навуковы кіраўнік – члены СНДЛ, студэнты – аспіранты / магістранты, так і ў плоскасці беларусы – кітайцы. Так адбываецца знаёмства студэнтаў з ліку замежных грамадзян са своеасаблівым беларускім гісторыка-культурным развіццём, уключэнне ўсіх членаў СНДЛ у полікультурны сацыяльны кантэкст.

Адукацыйнае асяроддзе сучаснай установы вышэйшай адукацыі ўяўляе сабой полікультурную сістэму, у якой ўзаемадзейнічаюць прадстаўнікі розных субкультур (нацыянальных, профільных, сацыяльных, узроставых і г. д.) як структурных адзінак культуры. Вывучэнне культурна-гістарычнага досведу пасродкам успрымання і аналізу мастацкіх твораў народнапесеннай традыцыі спрыяе фармаванню ў студэнтаў прафесійных кампетэнцый, якія дазваляюць эфектыўна рэалізоўваць майстэрства педагога ў полікультурным і полімастацкім адукацыйным асяроддзі.

Удзел у працы СНДЛ дапамагае студэнтам раскрываць свой акадэмічны патэнцыял, развівае даследчыя здольнасці, уменне адаптаваць навуковы матэрыял, вузкія тэмы навуковых даследаванняў для ўспрымання канкрэтнай аўдыторыяй слухачоў, выконваючы задачы навучання і інтэлектуальнага развіцця будучых педагогаў у галіне сучаснай мастацка-эстэтычнай адукацыі. Дзейнасць у складзе студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі «Дыялог мастацтваў» у сілу спецыфікі напрамку яе работы з'яўляецца паўнацэннай формай развіцця навуковых, псіхолага-педагагічных, а таксама артыстычных, музычных, харэаграфічных, мастацкіх здольнасцей студэнтаў. Яна з'яўляецца эфектыўным спосабам развіцця прафесіяналізму будучых педагогаў-музыкантаў.

Актуальнасць дзейнасці СНДЛ «Дыялог мастацтваў» у названым вышэй напрамку навуковага пошуку пацвярджаецца тым фактам, што канцэптуальна блізкія даследаванні музычнага мастацтва Беларусі праходзяць на базе Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь у аддзеле музычнага і выканальніцкага мастацтва. Зусім нядаўна ўбачыў свет першы том «Анталогіі нацыянальнай харавой спадчыны Беларусі» – «Рэцэпцыя нацыянальнай харавой спадчыны ў сучаснай беларускай музычнай культуры». «У першай кнізе першага тома Анталогіі нацыянальнай харавой спадчыны Беларусі прадстаўлены партытуры беларускіх кампазітараў, створаныя ў рэчышчы актуальных рэцэптыўных творчых стратэгій у сучасным мастацтве. Большасць твораў – рукапісы, якія публікуюцца ўпершыню. Канцэпцыя анталогіі прадугледжвае выканальніцкі падыход да публікацыі харавой партытуры і прэзентацыю матэрыялаў у электронным фармаце на спецыяльна распрацаваным сайце http://muspad.belcentre/by» [6]. У раздзеле «Мастацкая рэцэпцыя народнай спеўнай традыцыі» змешчаны апрацоўкі беларускіх народных песень a capella «А ў ляску, ляску» А. Рашчынскага, «Жаваронечкі» Л. Шлег, «Ехаў пан-капітан» А. Атрашкевіч, «Туман ярам» А. Саўрыцкага і інш. У рэчышчы тэмы прадстаўленага даследавання навукова-практычная дзейнасць СНДЛ «Дыялог мастацтваў» па вывучэнні і практычным засваенні твораў народнага і прафесійнага беларускага народнапесеннага мастацтва ў дзейнасці Уладзіміра Іосіфавіча Раговіча з'яўляецца актуальнай. Яна дазволіла раскрыць невядомыя старонкі музычнай культуры канца XX – пачатку XXI стагоддзяў. Змест размовы падчас правядзення круглага стала з удзелам супрацоўнікаў і загадчыка аддзела музычнага і выканальніцкага мастацтва ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», аўтарам больш як пяцідзесяці навуковых прац, кандыдатам мастацтвазнаўства Г. П. Цмыг, выкладчыкаў кафедр

тэорыі і методыкі выкладання мастацтва, музычна-педагагічнай адукацыі факультэта эстэтычнай адукацыі і членаў СНДЛ выявіў цікавасць з боку навукоўцаў да вынікаў даследавання студэнтаў.

Неад'емнай часткай дзейнасці СНДЛ «Дыялог мастацтваў» з'яўляецца практычная накіраванасць навукова-даследчай працы ў аспекце падрыхтоўкі метадычных матэрыялаў для выкладання такіх вучэбных дысцыплін, як «Народная творчасць», «Беларуская музыка». З удзелам членаў студэнцкай навуцова-даследчай лабараторыі са зборнікаў беларускіх народных песень запісу У. І. Раговіча былі адабраны найбольш яркія прыклады традыцыйнага мастацтва Беларусі ва ўсім яго жанравым і стылявым дыяпазоне, у тым ліку і XX ст., прааналізаваны ў гістарычным і агульнаеўрапейскім кантэксце. Напрамак даследаванняў СНДЛ дэманструе вялікую злучанасць прафесійнага музычнага мастацтва і музычнага фальклора.

СНДЛ «Дыялог мастацтваў» ажыццяўляе камбінаваныя праекты, якія з'яўляюцца комплекснай практыкаарыентаванай рэалізацыяй засваення сістэмы ўзаемасувязі розных відаў мастацтва, дыялогу розных культур. Мэта выкарыстання праектнай тэхналогіі пры вывучэнні беларускай народнапесеннай культуры – паглыбленне ведаў і ўдасканаленне уменняў, якія ўжо ёсць у студэнтаў у выніку вывучэння вучэбных дысцыплін мастацка-эстэтычнага напрамку, што прадугледжвае паўторнае выбарачнае ўспрыманне імі культурных тэкстаў і іх інтэрпрэтацыю, з аднаго боку. З другога боку, гэта засваенне педагагічных заканамернасцей, прынцыпаў, норм і тэхналогій, накіраваных на трансляцыю будучымі спецыялістамі духоўных каштоўнасцей, культурных норм і форм ужо сваім вучням, на рэалізацыю маладымі пакаленнямі каштоўнасных сэнсаў беларускай традыцыйнай культуры, зафіксаванай ў песнях, у жыцці і ў адносінах з іншымі людзьмі.

Каб паказаць месца азначаных праектаў у сістэме праектаў факультэта, прадставім яе цалкам і назавем некаторыя прыклады:

1. Творчы напрамак: «Метамарфозы», Фестываль народнай культуры, «Створым свой Зорны ФЭА разам», «Вялікае мастацтва натхняць», «Спяваем разам».
2. Прафесійны напрамак: «Малыя Дэльфійскія гульні», «Песні, апаленыя вайной», «Лабараторыя прафесійнага росту: 10 пытанняў майстру», анлайн-выстава «Па-за часам і прасторай».
3. Прафарыентацыйны напрамак: «Ствары сваю партытуру поспеху з ФЭА БДПУ».
4. Практыкаарыентаваны напрамак (сувязь з установамі адукацыі): «Дзіцячая філармонія (лекторый)», «Музычна-паэтычная гасцёўня» [7].
5. Валанцёрскі накірунак»: праекты Валанцёрскага атрада «Вясёлка» («Дом сустрэч», «Цацкі сваімі рукамі» і інш.).
6. Камбінаваныя праекты: «Ад культуры да навукі і мастацтва», «Народныя песні запісу У. І. Раговіча ў класе вакала»).

Такім чынам, навукова-даследчая дзейнасць у навучанні будучых педагогаў-музыкантаў непазбежна ўтрымлівае практычны кампанент. У той жа час, харавыя і сольныя спевы, ігра на музычных інструментах, харэаграфічная падрыхтоўка, мастацкая творчасць заканамерна змяшчаюць у сабе аспект навуковага пошуку, жаданне спрабаваць, ствараць новае на аснове вывучэння базавых прынцыпаў і вопыту папярэднікаў. Таму СНДЛ факультэта эстэтычнай адукацыі «Дыялог мастацтваў» спалучае ў сабе псіхолага-педагагічную накіраванасць дзейнасці з мастацтвазнаўчай і культуралагічнай, навукова-даследчую і практычную працу. Рэалізацыя навукова-даследчай дзейнасці ў галіне мастацка-эстэтычнай адукацыі спрыяе:

1) паляпшэнню прафесійнага забеспячэння сферы адукацыі праз прыцягненне таленавітай моладзі да ўдзелу ў навукова-даследчай, мастацка-эстэтычнай, ідэалагічна-выхаваўчай дзейнасці як розных аспектах падрыхтоўкі педагога-музыканта;
2) студэнта-цэнтрычнай падтрымцы таленавітай студэнцкай моладзі ў распрацоўцы новых ідэй і творчых праектаў;
3) захаванню і павелічэнню нацыянальнага культурнага патэнцыялу краіны;
4) інтэграцыі беларускай культуры ў сусветную сістэму, пашырэнню міжкультурнага дыялогу;
5) пашырэнню магчымасцяў захавання культурных каштоўнасцяў розных прафесій – політранслятараў мастацкіх ідэалаў, якія валодаюць пазачасавай каштоўнасцю.

### Літаратура


1. *Раговіч, У. І.* Песенны фальклор Палесся : у 3 т. / У. І. Раговіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2001–2002. – Т. 1 : Песні святочнага календара. – 2001. – 528 с.
2. Песенны фальклор Палесся : лірычныя песні / запіс Уладзіміра Раговіча / уклад. Н. Г. Мазурына. – Мінск : Беларуская навука, 2023. – 378 с. : іл. – (Фальклор нашага краю).


### References


1. *Ragovich, U. I.* Pesenny fal'klor Palessya : u 3 t. / U. I. Ragovich. – Minsk : Chatyry chverci, 2001–2002. – T. 1 : Pesni svyatochnaga kalendara. – 2001. – 528 s.
2. Pesenny fal'klor Palessya : lirychnyya pesni / zapis Uladzimira Ragovicha / uklad. N. G. Mazuryna. – Minsk : Belaruskaya navuka, 2023. – 378 s. : il. – (Fal'klor nashaga krayu).

3. *Мазурина, Н. Г.* Преемственность в развитии белорусского хорового искусства XX века (деятельность Г. Ширмы, Г. Цитовича, В. Роговича, М. Дриневского) / Н. Г. Мазурина, В. С. Пручковская // Педагогика искусства в целях устойчивого развития общества : материалы Междунар. научн.-практ. конф., г. Минск, 11 апр. 2024 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. Максима Танка; редкол. М. А. Шатарова (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2024. – (в печати).
4. *Мазурина, Н. Г.* Сборники белорусского песенного фольклора Владимира Роговича в профессиональной подготовке учителя музыки / Н. Г. Мазурина, Н. Н. Кот // Музыкальная культура и образование : Инновационные пути развития : материалы VIII междунар. научн.-практ. конф., г. Ярославль, 6 апр. 2023 г. / Яросл. гос. пед. ун-т им. К. Д. Ушинского ; под науч. ред. С. А. Томчук. – Ярославль : РИО ЯГПУ, 2023. – С. 56–60.
5. *Цзян, Яли.* Проблема сохранения фольклорного наследия в Беларуси и Китае: музыкально-педагогический аспект / Яли Цзян // Эстетическое образование : традиции и инновации = Эстэтычная адукацыя : традыцыі і інавацыі = The aesthetic education : traditions and innovations : материалы Междунар. студ. научн.-практ. конф., г. Минск, 20 апреля 2023 г. [Электронный ресурс] / Белорус. гос. пед. ун-т им. Максима Танка; редкол. : М. А. Шатарова (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2023. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).
6. Анталогія нацыянальнай харавой спадчыны Беларусі. У 3 т. Т. 1. Рэцэпцыя нацыянальнай харавой спадчыны ў сучаснай беларускай музычнай культуры. Кн. 1 / уступ. арт., навук.-давед. апарат, уклад.: Г. П. Цмыг [і інш.]; навук. рэд. Г. П. Цмыг; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр дослед. беларус. культуры, мовы і літ. – Мінск : Беларуская навука, 2024. – 524 с.: іл., нот.
7. *Черняк, В. А.* Культурно-образовательные проекты в области эстетического образования как активная форма подготовки студентов к внеучебной работе в школе / В. А. Черняк // Искусство и наука в образовательном пространстве : проблемы и перспективы : сб. ст. и материалов Междунар. науч.-практич. конф. 15 февр. 2019 г. ; под общ. ред. Г. Я. Вербицкой. – Уфа, 2019. – С. 31–36.

3. *Mazurina, N. G.* Preemstvennost' v razvitii belorusskogo horovogo iskusstva HH veka (deyatel'nost' G. Shirmy, G. Citovicha, V. Rogovicha, M. Drinevskogo) / N. G. Mazurina, V. S. Pruchkovskaya // Pedagogika iskusstva v celyah ustojchivogo razvitiya obshchestva : materialy Mezhdunar. nauchn.-prakt. konf., g. Minsk, 11 apr. 2024 g. / Belorus. gos. ped. un-t im. Maksima Tanka; redkol. M. A. Shatarova (otv. red.) [i dr.]. – Minsk : BGPU, 2024. – (v pechati).
4. *Mazurina, N. G.* Sborniki belorusskogo pesennogo fol'klora Vladimira Rogovicha v professional'noj podgotovke uchitelya muzyki / N. G. Mazurina, N. N. Kot // Muzykal'naya kul'tura i obrazovanie : Innovacionnye puti razvitiya : materialy VIII mezhdunar. nauchn.-prakt. konf., g. Yaroslavl', 6 apr. 2023 g. / Yarosl. gos. ped. un-t im. K. D. Ushinskogo ; pod nauch. red. S. A. Tomchuk. – Yaroslavl' : RIO YaGPU, 2023. – S. 56–60.
5. *Czyan, Yali.* Problema sohraneniya fol'klornogo naslediya v Belarusi i Kitae: muzykal'no-pedagogicheskij aspekt / Yali Czyan // Esteticheskoe obrazovanie : tradicii i innovacii = Estetychnaya adukacyya : tradycyi i inavacyi = The aesthetic education : traditions and innovations : materialy Mezhdunar. stud. nauchn.-prakt. konf., g. Minsk, 20 aprelya 2023 g. [Elektronnyj resurs] / Belorus. gos. ped. un-t im. Maksima Tanka; redkol. : M. A. Shatarova (otv. red.) [i dr.]. – Minsk : BGPU, 2023. – 1 elektron. opt. disk (CD-ROM).
6. Antalogiya nacyyanal'naj haravoj spadchyny Belarusi. U 3 t. T. 1. Recepcyya nacyyanal'naj haravoj spadchyny ŭ suchasnaj belaruskaj muzychnaj kul'tury. Kn. 1 / ustup. art., navuk.-daved. aparat, uklad.: G. P. Cmyg [i insh.]; navuk. red. G. P. Cmyg; Nac. akad. navuk Belarusi, Centr dasled. belarus. kul'tury, movy i lit. – Minsk : Belaruskaya navuka, 2024. – 524 s.: il., not.
7. *Chernyak, V. A.* Kul'turno-obrazovatel'nye proekty v oblasti esteticheskogo obrazovaniya kak aktivnaya forma podgotovki studentov k vneuchebnoj rabote v shkole / V. A. Chernyak // Iskusstvo i nauka v obrazovatel'nom prostranstve : problemy i perspektivy : sb. st. i materialov Mezhdunar. nauch.-praktich. konf. 15 fevr. 2019 g. ; pod obshch. red. G. Ya. Verbickoj. – Ufa, 2019. – S. 31–36.

ВЕНИЦ БГПУ